# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
11 лістапада
1993 года
№ 14(1702)


СВЯТА? СВЯТА!

## РОК СУПРАЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙ





***Калі б сённяшні нумар газеты выхадзіў гады трычатыры таму назад, ён быў бы святочным, прысвечаным чарговай гадавіне сацыялістычнай рэвалюцыі альбо, як зараз кажуць, кастрычніцкага перавароту.***

Але нягледзячы на тое, што сёння 7 лістапада — звычайны дзень (толькі дзякуючы нядзелі ён аказаўся непрацоўным), напярэдадні гэтай даты ва ўсіх корпусах універсітэта віселі лістоўкі-віншаванні з 76 гадавінай ад Партыі камуністаў Беларусі.

Студэнты, якія сёння абыякавыя да палітыкі, але нераўнадушныя да музыкі, па-свойму адзначылі 7 лістапада. Увечары яны сабраліся ў памяшканні Інстытута замежных моў на музычны сэйшн «Рок супраць рэвалюцый». Заплаціўшы ўсяго 2 тысячы рублёў, прысутныя слухалі выступленне грандаў беларускага року: «Мрою», «Уліс», «Зіндан», гасцей з Піцера, вядомага гітарыста «Кіно» Ігара Ціхамірава і не менш вядомага Аляксандра Ляпіна, гітарыста «ДДТ».

Што тычыцца мяне, то я разам з сябрамі 7 лістапада адзначаў шэсцьдзесят шостую гадавіну з пачатку будаўніцтва нашага універсітэцкага гарадка. Думаю, што адмяняць гэтае свята пакуль няма падстаў.

Алесь БІЦАРУК.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

### АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне пасад

**ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ** біяхіміі;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** тэарэтычнай фізікі; тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства; міжнародных адносін;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** тэарэтычнай фізікі; фізічнай электронікі; вышэйшай матэматыкі; філасофіі і метадалогіі навукі; генетыкі і біятэхналогіі; агульнага землязнаўства; фізічнай геаграфіі і аховы прыроды; навейшай гісторыі славянскіх краін; тэлебачання і радыёвяшчання; рускай мовы; агульнай экалогіі;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** інфарматыкі; інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** гісторыі журналістыкі і літаратуры; тэлебачання і радыёвяшчання; сусветнай і айчыннай гісторыі;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** радыёфізікі; інфарматыкі;

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 22050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, т. 26-59-39.

НАДОЕЧЫ

## ГУЛЬНІ Ў ПРЭЗІДЭНТА

Тым, хто хоць зрэдку бярэ ў рукі газету альбо калі-некалі глядзіць беларускае тэлебачанне, ужо добра вядома імя графа Аляксандра Прушынскага. Грамадзянін не то Канады, не то Польшчы на старасці гадоў вырашыў стаць прэзідэнтам Беларусі. Дзеля дасягнення гэтай мэты ён і праводзіць прэс-канферэнцыі, сустрэчы з грамадзянамі. Апошняя прайшла 5 лістапада ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце.

*Няхай даруюць мне чытачы, але пераказваць тую гутарку ў мяне няма ніякай ахвоты — нічога цікавага ў ёй не было. На руска-беларуска-польскай мове граф доўгі час спрабаваў даказаць нешматлікім прысутным, што яны дрэнна ведаюць гісторыю Беларусі і не хочуць усведамляць вялікую ролю сваёй рэспублікі ў еўрапейскай гісторыі. А калі прыйшоў час задаваць пытанні, то адказы графа былі прыкладна такімі:*

*— Каб Беларусь выйшла з крызісу, людзі павінны зразумець, што дзяржава за іх не будзе працаваць, кожны сам павінен зарабляць сабе на жыццё. І верыць у Бога...*

*На заканчэнні сустрэчы я запытаўся ў графа пра ягоную адукацыю, аказалася, што Аляксандр Прушынскі па адукацыі эканаміст, у свой час скончыў Політэхнічны інстытут машынабудавання. Відаць, ТАМ ёсць не толькі Гарварды і Оксфарды...*

Алесь ЮРЫН.

І ВЫ ЗМАГЛІ Б

## СТАЖЫРОЎКА Ў ГЕРМАНІІ

Як стала вядома ў Пасольстве Федэратыўнай Рэспублікі Германіі ў Беларусі, Нямецкая служба акадэмічных абменаў (ДААД) аб'яўляе конкурс для беларускіх вучоных, выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў і студэнтаў на атрыманне стыпендый для стажыроўкі ва універсітэтах Германіі ў 1994—1995 навучальным годзе. Удзел у конкурсе могуць прыняць асобы не старэй 32-гадовага ўзросту, якія, займаюцца навуковай работай і выдатна валодаюць нямецкай мовай.

Даведкі можна атрымаць у Пасольстве ФРГ, Міністэрстве адукацыі Беларусі, нямецкім культурным цэнтры імя Гётэ па тэлефонах: 33-07-52, 26-49-75, 20-39-97.

## ВОСЕНЬ — НА ЗЫХОДЗЕ, ІНФЛЯЦЫЯ — НА ЎЗЛЁЦЕ

Не зусім прыемнае паведамленне.

У лістападзе павышаецца стыпендыя. Прыкладна на 35 працэнтаў. Калі ў мінулым месяцы мінімальная стыпендыя складала 12.750 беларускіх рублёў, то ў гэтым — 17.000. А гэта азначае, што цэны (і не на 35 працэнтаў) зноў узрастуць да атрымання наступнай стыпендыі.

Так што, трымайся, студэнт.

ВЫ ЧУЛІ?

## БУГІ-ВУГІ

***Зноў пачынае праяўляць актыўнасць Студэнцкі клуб універсітэта. У холе галоўнага корпуса з'яўляюцца заманлівыя аб'явы... Пра далейшыя планы мы папрасілі расказаць мастацкага кіраўніка клуба* Інэсу АПАЛАЙКА.**

— 13 лістапада ў актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта.
Пачнецца канцэрт а 18 гадзіне і будзе праходзіць у рамках гарадскога фестывалю «Спадчына».

Не за гарамі ўжо і Міжнародны дзень студэнта.
20 лістапада а 19 гадзіне ў будынку былога Дома паліт-асветы (Кастрычніцкая, 5) мы праводзім святочную дыскатэку. Магу ўсіх запэўніць, што дваццатага ва ўсім горадзе не будзе лепшай студэнцкай тусоўкі. Дарэчы, білеты па ільготных цэнах прадаюцца толькі да 15 лістапада. Спяшайцеся!

ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

## І СВАБОДА НЕ Ў КАЙФ

***Саюз беларускіх студэнтаў занепакоены скарачэннем ваенных кафедраў ў ВНУ.***

Па словах старшыні Саюза А. Глушко, студэнт, які не прайшоў ваеннай падрыхтоўкі, пасля заканчэння ВНУ будзе прызваны на тэрміновую службу на агульных падставах. Кіраўніцтва Саюза беларускіх студэнтаў пачынае збор подпісаў у знак пратэсту. Сацыялагічная служба Саюза распрацоўвае анкеты для вывучэння і абагульнення пазіцыі студэнтаў па пытанню аб скарачэнні ваенных кафедраў. Вынікі даследвання будуць прадстаўлены ў Саўмін рэспублікі.

Пачалася ўся гэтая гісторыя з пастановы Саўміна № 152 ад 18.03.93 «Аб падрыхтоўцы студэнтаў ВНУ дзённай формы навучання па праграме афіцэраў запасу на ваенных кафедрах». Менш, чым праз месяц, выйшаў загад № 119 Міністэрства адукацыі, які прадугледжвае ліквідацыю ваенных кафедраў у шэрагу ВНУ і скарачэнне колькасці навучэнцаў на застаўшыхся.

Гады чатыры таму ва універсітэце ішла актыўная кампанія за свабоднае наведванне ваенных кафедраў. Аднак, калі жаданая свабода была атрымана, стала ясна, што салдацкую лямку лягчэй цягнуць ў ВНУ, чым у войску.

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

## ЗАЛІК ПА ЖАДАННЮ

***У Белдзяржуніверсітэце пачалі чытаць лекцыі два амерыканскія спецыялісты. Больш падрабязна пра гэта расказвае намеснік начальніка аддзела па замежных сувязях* Юрый Іванавіч ЧАБАТАРОЎ:**

— Наш універсітэт ужо не першы год удзельнічае ў праграме выдзялення стыпендый фонда Фул Брайта над эгідай ЮСІА. Яна прадугледжвае абмен паміж дзвюмя краінамі вучонымі, выкладчыкамі для правядзення лекцый і навуковай работы. У рамках гэтай праграмы да нас прыехалі спецыялісты па амерыканскай гісторыі Шэйры Дэвід і па эканоміцы Уільям Келі. На англійскай мове яны прачытаюць лекцыі для студэнтаў і выкладчыкаў па тэмах: «Амерыка пасля другой сусветнай вайны» і «Асабістае ўспрыняцце эканомікі і грамадства ЗША». Першыя лекцыі карысталіся павышаным інтарэсам. Акрамя новых ведаў, студэнты і выкладчыкі маюць магчымасць атрымаць добрую практыку па англійскай мове. Да таго ж, пасля заканчэння лекцый студэнты змогуць здаць залік, які пойдзе ў залікоўку.

Госці з Амерыкі таксама праяўляюць інтарэс да нашай краіны і да работы ва універсітэце. Шэйры Дэвід прывязла з сабой літаратуру па гісторыі ЗША і перадала яе гістарычнаму факультэту.

Універсітэт разлічвае на далейшае супрацоўніцтва з фондам Фул Брайта, які дапамагае нашым выкладчыкам выязджаць за мяжу. Так, выкладчык факультэта прыкладной матэматыкі прафесар Юрый Сямёнвіч Харын выязджаў нядаўна ў Амерыку, дзе займаўся сваёй навуковай працай і чытаў лекцыі ў Каліфарнійскім універсітэце.

***Тым, хто жадае паслухаць лекцыі выкладчыкаў са Злучаных Штатаў, нагадваем, што Шэйры Дэвід чытае свой курс кожны аўторак у 23 аўдыторыі гістарычнага факультэта. Лекцыі Уільяма Келі праходзяць па серадах у 463 аўдыторыі флфака.***

# «ТРЭБА ПАЗБАЎЛЯЦЦА АД КАЛАНІЯЛЬНАГА МЫСЛЕННЯ»

**Чацвёрты год дзейнічае ў рэспубліцы Закон аб мовах. Да 1 верасня гэтага года ён павінен быць выкананы па сямі артыкулах: «Аб мове сродкаў масавай інфармацыі», «Аб мове дакументаў», «Аб статусе грамадзян Беларусі», «Аб мове навукі і культуры», «Аб мове асабовых імёнаў», «Аб мове аб'яў і паведамленняў», «Аб мове маркіроўкі тавараў». Зразумела, што адказнасць за гэта нясуць у першую чаргу навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць спецыялістаў па ўсім галінам народнай гаспадаркі. Гэта датычыцца і буйнейшай у рэспубліцы ВНУ — Белдзяржуніверсітэта. Аб тым, што зроблена і што яшчэ трэба зрабіць, каб мова нацыі стала мовай дзяржавы, гутарка нашага карэспандэнта з Уладзімірам Аляксандравічам Навумовічам, загадчыкам кафедры беларусазнаўства.**

**— Уладзімір Аляксандравіч, прайшло тры гады, як быў прыняты Закон аб мовах. Гэта многа ці мала?**

— Тры гады — гэта той тэрмін, які быў вызначаны Законам для пераводу навучальнага працэсу на беларускую мову. На два гады больш даецца работнікам дзяржаўных устаноў для авалодання беларускай мовай. Гэта, здаецца, невялікі час, але мы не заўсёды ўяўляем, што за 3—5 гадоў ва універсітэце змяняецца пакаленне студэнтаў, і тыя, хто паступіў у год прыняцця Закону, ужо заканчваюць вучобу. Такім чынам, вялікі атрад спецыялістаў уліецца ў народную гаспадарку будучы па сутнасці дынацыялізаваным. Гэта будуць для нас даволі адчувальныя страты. Большасць студэнтаў чацвёртых і пятых курсаў зразумелі, што ісці працаваць без ведання мовы неперспектыўна. Яны звятаюцца да нас з лістамі арганізаваць курсы, якія б дапамаглі атрымаць веды і авалодаць беларускай мовай у межах выканання імі сваіх прафесійных абавязкаў. Не заўсёды мы можам задаволіць гэтыя патрабаванні, бо даганяць заўсёды цяжэй, трэба вылучаць дадатковыя рэзервы: гадзіны і зарплату выкладчыка, «вокны» у і без таго перагружаных вучэбных праграмах. Гэта робіцца дзеля таго, каб не адстаць ад часу, але сведчыць, што мы працуем не з поўнай аддачай на будучыню. Неяк сталася, што за размовамі пра эканоміку мы забываемся на хлеб духоўны. Гэта пагражае для Беларсі стратай цэлага пакалення спецыялістаў, што стануць кіраўнікамі вытворчасці, маючы вельмі цмянае ўяўленне пра свае карані і нацыянальны грунт.

**— Вы лічыце, што глыбока прадуманая праграма пераводу навучання ў ВНУ на беларускую мову магла б даць большы эфект?**

— Так, несумненна, большы. Праграма прадугледжвае не толькі авалоданне гутарковай мовай, гісторыяй. культурай (гэта значыць павышэнне агульнаадукацыйнага ўзроўню нашага студэнцтва), але і праца над падручнікамі, слоўнікамі, метадычным матэрыялам. А гэта праца не аднаго дня. Яна патрабуе не спарадычнага падыходу, а глыбокай зацікаўленасці і неабходнасці быць запатрабаванай грамадствам і часам. Нам трэба пазбаўляцца ад каланіяльнага мыслення. Авалоданне беларускай мовай, літаратурай, культурай павінна праходзіць на ўзроўні генетычным, перадавацца з пакалення ў пакаленне, павінна пранікаць у свядомасць і падсвядомасць кожнага. Інакш гэта будзе толькі імітацыя выканання Закона аб мовах, імітацыя дзейнасці, а не сама дзейнасць.

**— Але ж існуюць прыхільнікі двухмоўя. Яны хочуць надаць статус дзяржаўнай рускай і беларускай мовам.**

— Такі падыход немінуча прыводзіць да паглынання адной мовы другой, да выцяснення мажарытарнай мовай, дамініруючай у дадзеным грамадстве, мінарытарнай мовы, мовы якая знаходзіцца ў больш занядбаным стане. Па сутнасці гэта вядзе да аднамоўя. Прыкладам можа служыць Фінляндыя, дзе існуюць дзве мовы: мажарытарная фінская і мінарытарная шведская. Знікненне шведскай мовы відавочна. Зрабіць у Беларусі дзяржаўнымі дзве мовы, значыць зліквідаваць мову карэннага насельніцтва, пакінуць яе на сіроцкае існаванне, як было дагэтуль. Нездарма вучоныя славісты ўсяго свету імкнуцца садзейнічаць у вывучэнні і развіцці моў невялікіх народаў, праяўляюць цікавасць да беларускай мовы як адной з самых старадаўніх.

**— Але не ўсе ведаюць сапраўдную беларускую мову і гавораць на «трасянцы».**

— Праз гэта трэба прайсці і не баяцца. Экалагічна чыстае моўнае асяроддзе у нас будзе створана яшчэ не хутка. Але гэты час трэба набліжаць. Большасць не разумее і ігнаруе вывучэнне і мовы, і багатых культурных пластоў. Моўную культуру выхоўвае і бюракратычная папера і рэкламная шыльда. Патрэбна толькі жаданне авалодаць мовай.

**— Ці не запаволіць нашу далучанасць да сусветнай навукі перавод выкладання на беларускую мову?**

— Гэта пытанне часта абмяркоўваецца, але па майму глыбокаму перакананню, нам гэта не пагражае, бо пераклад інфармацыі нават самай складанай з навуковай на звычайную лагічна завершаную мову сведчыць толькі аб ступені нашага валодання гэтым прадметам. Згадзіцеся, што аб складаных і глыбока тэарэтычных рэчах можна гаварыць вельмі проста і дакладна. На любой мове. У падцверджанне таму ёсць шмат прыкладаў. Вядучыя вучоныя чытаюць свае лекцыі на беларускай мое. А, увогуле, мова навукі — інтэрнацыянальная. Важна толькі зразумець, што глыбока нацыянальнымі павінны быць фундамент, глеба навукі. Нават характар нашай раўніннай мясцовасці уплывае на нашую свядомасць, як кожная былінка, помнік даўніны.

**— Наколькі моцныя сілы, што процістаяць ажыццяўленню Закону аб мовах?**

— Самае парадаксальнае, што сёння гэтыя сілы амаль не адчуваюцца. Наадварот, складваюцца ўсе ўмовы для ажыццяўлення Закона. Часцей гучыць беларуская гаворка ў сценах універсітэта, усё больш выкладчыкаў чытаюць лекцыі на беларускай мове. Напэўна, тут адчуваецца вельмі памяркоўная і роўная пазіцыя нашага рэктарата ў дачыненні выканання Закона аб мовах. Прынясці пэўны плён і створаныя ў свой час беларускамоўныя плыні. Распачалася падрыхтоўка слоўнікаў, падручнікаў па ўсім галінах вышэйшай адукацыі. Працавалі курсы па беларускай мове для студэнтаў і выкладчыкаў, пакуль пераклалася дакументацыя. Так, напрыклад, здадзены ў набор «Руска-беларускі слоўнік па фізіцы, матэматыцы і інфарматыцы» на 20.000 слоў, які склалі загадчык кафедры біяфізікі С. М. Чаранкевіч, прафесара кафедры з фізічнага факультэта і Т. П. Піліповіч, старэйшы выкладчык кафедры беларусазнаўства. Ідзе вывучэнне мовы і ў творчых гуртках, што створаны на гістарычным, геаграфічным, юрыдычным, механіка-матэматычным факультэтах, дзе студэнты вывучаюць беларускія традыцыі. праводзяць святы «Гукання вясны», «Каляды», «Дзяды», «Беларускае вяселле».

**— Уладзімір Аляксандравіч, што, на вашу думку патрэбна, для таго, каб моўнае асяроддзе пашыралася?**

— Я глыбока перакананы, што нам неабходна як мага паўней і глыбей весці падрыхтоўку спецыялістаў, даючы ім культурны грунт. Сапраўдны універсітэцкі. Патрэбна выхоўваць нацыянальную інтэлігенцыю, адухоўленую, для якой служэнне сваіму народу стане сэнсам жыцця. У культуры за якую нітачку ні пацягнеш, яна доўга ўецца. Сёння падзел на класы і нацыі не мае пад сабой грунту. Паняцці народа і культуры атаясамліваюцца. Мы павінны быць людзьмі пэўнай культуры, культуры Беларусі. краіны, што размешчана ў цэнтры Еўропы. Узнікае сітуацыя, калі межы дзяржавы імкнуцца супасці з межамі нацыянальнай культуры. Яны накладваюцца адзін на адно як на матрыцу. Культура павінна быць пакладзена ў аснову дзяржаўнай палітыкі. Культура не як «адзенне душы», а як «сама душа». Інтарэсы дзяржавы — ў адзінстве гэтай культуры, у яе развіцці. А інтарэсы кожнага чалавека — у жаданні авалодаць ёю. Вось тут важна ўсё: і мова, і гісторыя, і літаратура. Нам усім трэба старанна і дбайна ўзворваць, аздабляць культурныя, пладаносныя пласты нашага жыцця. ствараць культурную аўру, якую нялёгка будзе разбурыць, але якая будзе выяўленнем нашай з вамі сутнасці як патрыётаў сваёй радзімы.

Гутарыла Наталля **КРЫШТОПЕНКА.**

# НЯХАЙ «ШМАНАЮЦЬ» ФРАЕРЫ...

***Що боже, ти мій господе!***
***Чого нема на тій ярмарці!***
***Колеса, скло, деготь, тютюн, ремень,***
***Цибуля, крамарі ваякі...***
***Так, що хоть би в кишені було***
***Рублів з тридцать, то й тогді б***
***Не закупів усіеі ярмаркі.***

*З маларасійскай камедыі.*

**І сапраўды, госпадзі божа мой, чаго толькі няма на сучасным беларускім рынку... прабачце, базары. «Марс», «Снікерс», «Мальбара», «Кэмал», долары, марачкі, «расія»... Але хоць і маеш у кішэні запаветныя трыццаць рублёў, і нават значна болей, усё роўна вельмі не разгонішся, «Марсам» са «Снікерсам» сыты не будзеш. Камароўка — гэта не Сарочынская ярмарка. Тут іншая сістэма вымярэння. Ва ўсім свеце базар існуе для бедных, у нашай постсавецкай сістэме — выключна для багатых. А магазіны, здаецца, увогуле не патрэбны. У іх няма і паловы таго, што можна знайсці на рынку. Маянэз, напрыклад. Яго няма ў магазіне, але нават тады, калі завод закрыты на рамонт, ён ёсць на Камароўцы.**

**Дырэктар рынку, Анатоль Валянцінавіч Ішчанка, аказаўся чалавекам вельмі занятым. Размова прайшла хутка, у халоднай і нервовай абстаноўцы. Пасля першых пытанняў стала ясна, што дырэктар адказны толькі за тое, каб на рынку была чым гандляваць, каб усе плацілі за месца і не было ніякіх парушэнняў правілаў гандлю.**

***— А хіба можна пракантраліраваць выкананне ўсіх правілаў?***

— Зразумела, не. Але калі вы знойдзеце хоць адзін кілаграм неправеранага мяса, я скажу, што яны не выконваюцца ўвогуле.

**Крута.**

**Мяса. Яно ўвесь час не давала мне спакою. Маладая цяляціна, свежыя ружовыя стужкі дарагой свініны. Бараніна... яна адразу ўяўлялася на шампуры: з яе сцякае крывавы сок змешаны з белым віном, і нос цыкоча заманлівы даперабудовачны пах, пах добрага шашлыка. Тоўстыя індычкі з какетліва задранымі ўгору нагамі, паніклыя выпешчаныя курыныя тушкі. Сала — ад старога парыжэлага да вэнджанага з апетытнай проразззю пяшчотнага мяса колеру клубніцаў у малацэ. Завалы гавяжых костак, рагоў і капытаў. І зусім, як у Гогаля, — свіное рыла.**

***— Па чым?***

— 2 тысячы кілаграм.

**Малады чалавек, па ўсяму бачна студэнт, уважліва глянуўшы ў свіныя вочы і прыкінуўшы ў галаве (відаць, матэматык — прадаўшчыца лічыла на калькулятары), што рыла пацягне кілаграм гэдак на 10, а гэта значыць на ўсю стыпендыю асцярожна адыйшоў ад яго ў напрамку піражкоў, наіўна спадзеючыся, што яны з мясам.**

**А якіх мужыкоў можна пабачыць у гандлёвых радах Камароўкі! Далі бог, нідзе болей у Мінску вы такіх не сустрэніце.**

***— Анатоль Валянцінавіч, чаму атрымліваецца, што ледзь не палова мяса на рынку гандлююць перакупшчыкі?***

— А навошта бабульцы, якая прыехала з 10 кг уласнай свінні, стаяць з імі ўвесь дзень на рынку? Ёй адразу прапаноўваюць купіць усё. Яна згаджаецца, значыць, ёй гэта выгадна. А што датычыцца перакупшчыкаў, то такая сістэма існуе ва ўсім свеце: хтосьці вырабляе тавар, хтосьці яго прадае. У рэшце рэшт, перакупшчыкі мяса варты большай павагі, чым гэтыя... «доллары, марачкі».



**Сапраўды, ну хто такі валютчык? А як глянеш на такога мясніка ў акрываўленым белым халаце з сякераю ў руках, паспрабуй не запаважай і не прадай яму свае 10 кілаграмаў. Тым больш, каб гандляваць самой бабульцы трэба прайсці масу працэдур: праверыць, узважыць мяса і атрымаць спраўку, аплаціць за месца, халат і іншы інвентар, дамовіцца наконт вагаў. Можа, на самой справе не варты гэтыя 10 кг такой валакіты? У перакупшчыкаў жа тут усё падвязана. У іх нават ёсць дакументы, што яны ўладальнікі каператураў і вырошчваюць мяса ўласнавыгадаваных свіней. Але, бог з імі, перакупшчыкамі, свае мужыкі — не шкада.**

***— Анатоль Валянцінавіч, на рынках Масквы і Піцера забаронена гандляваць карабейнікам з усходніх краін. Ці не стала іх болей на Камароўскім і іншых рынках горада?***

— Не заўважыў. Ды іх проста не можа стаць болей — колькасць гандлёвых месцаў абмежавана.

***— Ну чаму ж? Пустуе агромісты сектар на адкрытым рынку.***

— Пустуе, таму што не жадаюць пашыраць гандаль прамысловымі таварамі, а сельскагаспадарчай прадукцыі ў Беларусі аказваецца няма. Прынамсі на рынак яе не вязуць. Дарэчы, а чаму трэба забараняць гандаль якасным і экалагічначыстым прадуктам? Той жа курагой і чарнаслівам. (Такая забарона сапраўды існуе. І на гандаль не толькі чарнаслівам, але і кветкамі. — В. У.). Дзе я вазьму гэты тавар, калі самі армяне ці азербайджанцы яго не прывязуць? А яны ўжо і без забарону не паедуць: не выгадна, а часам і стратна. За пераезд толькі адной граніцы, неафіцыйна, канешне, трэба заплаціць паўмільёна. Таму і цэны на рынку такія... А ўвогуле, на Камароўцы ёсць усё. Для тых, хто мае грошы.

**Ніхто з гэтым і не спрачаецца. Асабліва з апошнім. Але калі заканчваецца прывезены тавар, азербайджанцы не заўсёды спяшаюцца на радзіму, а пачынаюць тут шукаць сабе новы занятак. І знаходзяць. У лепшым выпадку перапрадаюць глазураваныя сыркі, прызначаныя для дзіцячых садкоў і бясплатных школьных сняданкаў.**

***— А які тавар лічыцца на рынку самым хадавым?***

— Гарэлка. Хаця... для каго — гарэлка, для каго — цыгарэты. Для яўрэя, увогуле, — цялячая печань.

***— Часта да вас прыходзяць пакупнікі са скаргамі.***

— Не. Скардзяцца толькі на культуру абслугоўвання. Іншых скаргаў: абвесілі ці не дадалі — я не прымаю. Рынак — гэта стыхія. Тут увогуле не павінна быць ніякіх вагаў. Расклаў свой тавар кучкамі, і сёння гэта кучка каштуе столькі, а заўтра, у залежнасці ад шматлікіх прычын, столькі.

***— Але гэтая стыхія чамусьці ніколі не вагаецца ў бок пакупніка. Цэны толькі павышаюцца і ніколі не паніжаюцца.***

— Вы думаеце? 9, 10 кастрычніка ў нас была ярмарка. Прыехалі калгасы, каператывы, народ бульбу выкапаў, таксама прыехаў. Мяса з 10 упала да 3,5 тысяч рублёў, бульба — са 150 да 90. Ды і ў выхадны дзень цэны не такія, як у будні. Калі ў сераду на рынку 3 тоны мяса і прадаецца яно па 10 тысяч за кілаграм, то ў суботу і нядзелю яго прывозяць 15 тон і каштуе яно ўжо 7 тысяч. Той, хто ведае, што такое рынак, прыходзіць па выхадных у другой палове дня.

***— А ці мае рынак свой прыбытак?***

— Мае. У канцы года разлічваем на 15 млн. Хаця даход значна большы. Вельмі вялікія сродкі ідуць на рамонты. Камароўка — гэта месца, дзе раней было балота. Колькі тон асфальту сюды выкінута, ніхто не ведае, а ён так і ідзе ў балота. Але ўсё ж такі Камароўскі рынак — адзін з самых чыстых рынкаў былога Саюза. Нягледзячы на тое, што прыбіральшчыкаў не хапае, дагледжваецца рынчная тэрыторыя раніцай, вечарам і нават днём. Ужо пакладзены новы асфальт, адрамантавана каналізацыя. Трэба аднаўляць купал, на гэта патрабуецца 700 мільёнаў рублёў. Рамонт аднаго гандлёвага стала з навесам абыходзіцца ў 500 тысяч рублёў. Такіх сталоў 30, толькі на самой Камароўцы. А ёй падпарадкоўваюцца ўсе іншыя рынкі горада: Чэрвеньскі, Чыжоўскі. Курасоўшчынскі, Старажоўскі...

**Сапраўды, каму не зразумела, што дырэктару буйнейшага рынку рэспублікі з мафіяй дзяліць няма чаго. На гэтым і разышліся. На развітанне я яшчэ раз звярнула ўвагу на томікі збораў твораў Леніна, Маркса і Энгельса. І паспрабавала ўспомніць, ці ёсць там што пра тавар «кускамі».**

**Астстнімі праблемамі на Камароўцы займаецца міліцыя. Можа, калісьці на рынку і гандлявалі сумленна. Але толькі не сёння. Не атрымліваецца. Законы не дазваляюць. Просты прыклад. У лютым 1993 года, калі пачаў працаваць платны рэчыўны рынак на «Дынама», Камароўка ператварылася ў плацдарм жадаючых пагандляваць «нахаляву». Іх аказалася значна болей, чым можна было сабе ўявіць. Рашэннем гарвыканкама гандаль прамысловымі таварамі быў забаронены. Вельмі доўга і з вялікімі цяжкасцямі давялося гэтае рашэнне выканаць. Праз некаторы час было дазволена гандляваць таварамі ўласнага вырабу, а потым, праўда, толькі інвалідам і пенсіянерам, імпартнымі рэчамі. У выніку — гандлююць усе і ўсім, з рук і прылаўкаў. А прадукцыя фабрыкі «Мілавіца» стала чамусьці самым папулярным таварам «уласнага вырабу».**



***— А з чаго складаецца Ваш даход?***

— З уласнага гандлю, платы за месца і штрафы, з уласнага гаражу ў 27 машын. Хто можа карыстацца паслугамі гаража? Кожны, хто здольны заплаціць 700 рублёў за кіламетр. Часцей за ўсё, гэта фірмы, кааперaтывы, якія возяць тавар за мяжу ці з-за мяжы. Бывае, і прыватныя асобы.

**У мяне заставалася тры хвіліны. Было зададзена наіўнае пытанне пра мафію...**

*(Праця. у наступным нумары).*

# АЎДЫТОРЫЯ № 7

У МІНУЛЫМ НУМАРЫ «БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА» МЫ ПАЧАЛІ ЗНАЕМІЦЬ ЧЫТАЧОЎ НАШАЙ ГАЗЕТЫ З ВЯДОМЫМ РОК-ГУРТАМ АС/ ДС. НАГАДВАЕМ, ШТО АЎТАР АРТЫКУЛА — УЛАДЗІМІР ЗАЙЧАНКА — ПРЭЗІДЭНТ МІНСКАГА РОК-КЛУБА З 1987 ГОДА, АЎТАР ШМАТЛІКІХ ПЕСЕНЬ, ВЯДУЧЫ ПЕРАДАЧЫ ПРА РОК НА БТ ПАД НАЗВАЙ «РОК-АРХІЎ».

## АС / ДС — РОКАВАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ, ЯКАЯ Б’Е ПА ГАЛАВЕ

### ДЛЯ ТЫХ, ХТО З РОКАМ»

Замена адбылася пасля конкурсу спевакоў, арганізаванага гуртам 19 красавіка 1980 года.

На працягу некалькіх гадзін быў праслуханы шэраг «кандыдатаў». Вкалістам стаў Брайан Джонсан з легендарнага хард-рокавага гурта «Джорджы», які да таго часу ўжо меў салідны вопыт работы на сцэне і з 1973 года запісаў 4 альбомы. Зразумела, публіка і крытыкі адобрылі такі выбар — асабліва добра адзываліся пра голас Джонсана. Дынамічны, агрэсіўны выканаўца на сцэне — у звычайным жыцці зусім іншы. Джонсану вельмі падабаецца гуляць у гольф і два дні на тыдзень ён праводзіць на газоне. Пасля серыі кароткіх рэпетыцый гурт пачаў запіс сваіх песень з новым спеваком. Быў створаны дыск «Назад, у Чорнае», які з’явіўся ў продажы ў жніўні 1980 года. Альбом быў завершаны за два месяцы. Хваляванні і эмоцыі, якія перажываў гурт з-за смерці Скота, знайшлі адлюстраванне ў такіх кампазіцыях, як «Пякельныя званы» альбо «Ты трасеш мяне ўсю доўгую ноч». Нягледзячы на неадпрацаванасць і нейкую паспешлівасць у запісу, гурт хацеў данесці свае пачуцці да слухачоў як мага хутчэй. Альбом стаў найбольш удалым з усіх ранейшых. За ўвесь час было прададзена звыш 8 мільёнаў кружэлак па ўсім свеце. Нават самі члены гурта, цяпер ужо стала зацвердзіўшыся ў рангу «суперзорак», не чакалі такога поспеху.

*«Вопыт з «Назад, у Чорнае» быў падобны на фантазію, — гаворыць Брайан Джонсан. — Мы не ведалі, як гурт будзе прыняты без Бона, Малькольм і Ангус не ведалі, ці жадаюць яны наогул іграць рок-н-рол. Але калі мы пачалі іграць, то ноты адна за другой самі знаходзілі сваё месца. Гэта было падобна на чараўніцтва. Мы на рабілі нічога, што б адрознівалася ад мінулага — мы проста ігралі сваю музыку, але альбом атрымаўся дасканалы як ніколі».*

*«Смерць Бона па волі выпадка зрабілася фокусам звышувагі да гурта, — гаворыць Малькольм. — І чалавек, які раней не чуў АС/ДС, казаў, што гэта захоплівае, а многія нашы фаны гэтым першым альбомам пасля смерці Бона нанова адкрылі для сябе АС/ДС. Здаецца, яны палюбілі тое, што пачулі...» Гурт на гэтым не супакоіўся.*

*АС/ДС узяў курс на новае 10-месячнае турнэ.*

Паклоннікі плацілі немалыя грошы, каб пабачыць, як выступае гурт, як спявае Джонсан і самае галоўнае — як абыходзіцца са сваёй гітарай «дэман» Ангус Янг, пабачыць ягоныя скокі і танцы па ўсёй сцэне, пачуць моцныя гукі яго гітары. Апрануты ў свой да болю знаёмы ўсім форменны школьны касцюм, кашулю, гальштук, шорты і кепачку, Ангус Янг ствараў страшэнны кантраст паміж сваім бязвінным «анёльскім»выглядам і гітарай са страшэнным ровам. Некаторыя элементы абавязковай шоў-праграмы АС/ДС належаць толькі ім адным. Напрыклад, калі Ангус Янг разам з гітарай узбіраецца прама на шыю Брайану Джонсану у той час, калі той спявае. Паспрабуйце ўявіць сабе Рычы Блэкмара на шыі ў Яна Гілана альбо Пэйджа вярхом на Роберце Планце — роста жах, ну а для АС/ДС такое шоў — нармальна.

*Сам Ангус ставіцца да сваіх трукаў крытычна.*

*«Я ніколі не ўспрымаю сябе як шоў-мэна, — тлумачыць Ангус. — Я толькі рок-н-рольшчык і раблю тое, што ў мяне ў душы, не больш. Сама ідэя школьніка ў форме з’явілася, калі мне было гадоў 10—11 і я іграў у складзе старэйшых сяброў у сваёй школе ў Аўстраліі. Усім гэта вельмі падабалася, яны прасілі мяне так і заставацца ў гэтай форме. Яны ўсім казалі: «Прыходзьце паглядзець на нашу маленькую гітарную «зорку». Ягоная школьная форма такая ж абавязковая, як скура у «Джудас Прыст», чорныя пінжакі і штаны Блэкмана альбо нязменныя джынсы і белыя майкі «Статус Кво».*

Між іншым, вернемся да сусветных гастролей АС/ДС. Яны былі паспяховымі і прынеслі гурту звыш 15 мільёнаў долараў. Гурт з’яднаўся, усе адчувалі, што прыйшоў час зрабіць які-небудзь новы крок у сваёй кар’еры. Яны прыехалі ў Парыж, прыйшлі ў студыю гуказапісу са сваім прадзюсерам Лангам, каб пачаць працу над новым альбомам, які Джонсан прапанаваў назваць так: «Нават больш важна, чым назад у чорнае». Праз шэсць тыдняў яны вярнуліся да сябе ў Англію з канчатковым прадуктам, названым больш урачыста і праграмна — «Для тых, хто з рокам, мы салютуем табе». У гэтых цяжкіх гуках і даступных мелодыях было шмат з раней запісанага і найбольш дастойнага, але гэта было і чымсьці новым.

Новы альбом яшчэ не атрымаў сусветнай папулярнасці, а ўсе вакол ужо ў адзін голас казалі, што ён значна перавышае ўсе папярэднія праграмы АС/ДС, хоць «Назад, у Чорнае» і праз год уваходзіў у пяцёрку самых прадаваемых, а колькасць распраданых кружэлак перавысіла 8 мільёнаў штук. Выдадзены ў 8 краінах ён прынёс гурту 27 «залатых» і «Плацінавых» узнагарод.

*«Для тых, хто з рокам...», — казаў Брайан Джонсан, — больш цяжэйшы, чым «Назад, у Чорнае», але гэта сапраўдны прадукт нашай любові да року. Цяпер у нас толькі адна праблема — выпускаць увесь час музыку ў традыцыях нашага гурта». 26 снежня 1981 года дыск АС/ДС «Для тых, хто з рокам...» упершыню ўзначаліў хіт-парад альбомаў у ЗША.*

Затым было чарговае турнэ, пайшлі чуткі, што АС/ДС жадае зрабіць відэаканцэрт альбо запісаць новы канцэртны альбом. Брайан Джонсан заўсёды смяяўся з такіх здагадак.

*«Мяне забаўляе, калі я чую, як нехта гаворыць пра тое, што мы плануем і што мы збіраемся рабіць, — гаворыць ён. — Бывае, што мы абмяркоўваем магчымасць выпуску канцэртнага альбома альбо відэа, але звычайна вырашаем яшчэ пачакаць. Лепш вярнуцца ў студыю гуказапісу і працаваць над новым матэрыялам».*

Аднак відэаканцэрт АС/ДС усё ж такі быў запісаны, а сама песня «Для тых, хто з рокам, мы салютуем табе» зрабілася абавязковым номерам у канцэртнай праграме гурта. Звычайна яна ладзілася пад грукат салюта дэкаратыўных гармат, якія ўстанаўліваліся па версе грандыёзнай сцэны. Грукат кармат, напэўна, нязменны атрыбут агульнага шоў, як і «рокавая харэаграфія» Ангуса, кепка Джонсана альбо лысая галава новага ударніка Крыса Слэйда.

### ЗЛАМАЙ СВАЁ ВІДЭА

Напэўна, прыйшоў час сказаць і пра замены ў складзе гурта. Цікава, што з моманту стварэння АС/ДС у 1973 годзе прайшло ўжо 20 гадоў, а склад музыкантаў застаўся амаль нязменным, больш таго, касцяк з гітарыстаў — братоў Мількольма і Ангуса Янгаў да гэтага часу на сцэне. Была замена вакаліста, у сувязі з яго смерцю ў 1978 годзе, гурт змяніў бас-гітарыста Марка Эванса на Кліфа Віліамса, і два разы была замена барабаншчыкаў. Філ Рад правёў у АС/ДС аж 10 гадоў і запісаў з гуртам 8 альбомаў, але ў 1983 годзе выхаду альбома «Пстрычка выключацеля» ён вырашыў кінуць гурт і рок-сцэну наогул. Філ паехаў назад у Аўстралію і пасяліўся дзесьці ў Мельбурне.

На яго месца прыйшоў Сайман Райт з гурта «Цітані», але ён не прыжыўся ў АС/ДС, хоць і прабыў там некалькі гадоў. 1985—1986 гады гурт правёў у гастролях па ЗША, Еўропе, Брытаніі і Лацінскай Амерыцы, пасля чаго быў запісаны ў Швейцарыі альбом «Муха на сцяне», а праз год з’явіўся і новы дыск «Хто зрабіў каго?», які, між іншым, уяўляе сабою гукавую дарожку для фільма «Максімальнае ўзмацненне». І тут Сайман Райт перайшоў у зусім іншы «лагер». Справа ў тым, што ў Лос-Анджэлесе Роні Джэймс Дыо, які абраў гэты каліфарнійскі горад месцам свайго пражывання, вырашыў, нарэшце, рэфармаваць свой асабісты гурт «Дыа», які паступова разваліўся пасля ўходу выдатнага гітарыста Вівіана Кэмпбела да Дэвіда Коўэрдэйла ў «Уайтснейк». Калі на яго месца быў узяты нікому невядомы 17-гадовы гітарыст Ровен Робертсан, то ветэраны гурта «Дыа» — чырвонавокі басіст Джымі Бэйн і барабаншчык Віні Эппіс, якія ігралі з Дыа з моманту стварэння гурта ўжо больш пяці гадоў, — усё ж вырашылі, што ім лепей кінуць Роні Джэймса, таму што нічога добрага з такога праекта не атрымаецца.

Такім чынам, Сайман Райт, што кінуў АС/ДС, сеў на вакантнае месца за барабанамі ў Дыа і заняўся «цяжкім металам», а ў АС/ДС адбылася апошняя і ўсяго чацвертая за 20 год замена ў складзе: з’явіўся выдатнейшы ўдарнік Крыс Слэйд, вядомы ўсім па рабоце ў гурце клавішніка Манфрэда Мэна, дзе ён з самага заснавання калектыва — 1971 года, правёў 8 гадоў і запісаў восем «класічных» альбомаў гэтага легендарнага калектыва.

Затым Крыс быў некалькі гадоў у гурце «Фірма», які стварылі яшчэ дзве «легенды рока» — гітарыст «Лед запелін» Джымі Пэйдж і адзін з самых унікальных вакалістаў 70-х гадоў — Поль Роджэрс з «Бэд компані». Але «Фірма» запісала ўсяго два альбомы — штосьці не ладзілася ў «ветэранаў», і вось Слэйд з’явіўся ў АС/ДС.

Гэта дало магчымасць гурту, амаль пасля двухгадовага перапынку запісаць альбом «Зламай сваё відэа», што падцвердзіла славу АС/ДС як аднога з самых значных ансамблей стыля «хард-рок».

Ну а самымі апошнімі падзеямі ў жыцці гурта былі, здаецца, выпуск пакуль апошняга альбома «Рок-н-рольны д’ябал» і іх прыезд у Маскву і выступленне на летнім полі ў Тушына, дзе сабралася ледзь не паўмільёна «фэнаў» і 11 тысяч міліцыянераў і салдат.



### БІТВА ПАД МАСКВОЙ

Яшчэ зусім нядаўна, пяцьшэсць гадоў таму, сярод усіх прыхільнікаў рок і поп-музыкі хадзіла думка, што да нас на гастролі могуць прыехаць толькі самыя «гнілыя» гурты, якія ў іншых краінах ужо даўно нікога не цікавяць.

Прыкладаў такіх можна прывесці шмат, пачынаючы ад «дыскавых» куміраў «Боні М» і заканчваючы нікому не вядомым гуртам «Доулі Фэмілі», які з-за адсутнасці чагосці лепшага прымалі ў Мінску з захапленнем, як сапраўдную брытанскую рок-каманду.

Цяпер мне пра гэта смешна ўспамінаць, асабліва тады, калі пабыў на канцэртах такіх рок-монстраў, як «Пінк Флойд», «Блэк Саббат» альбо «Скорпіёнс». Ну, а пасля таго, як выпала пагаварыць асабіста з Янам Гіланам альбо музыкантамі «Назарэт», пачынаеш верыць, што сапраўды ў гэтым свеце тое-сёе змянілася. Напэўна таму прыезд АС/ДС у Маскву для ўсіх ужо не быў такой вялікай сенсацыяй.

Іх выступленне пачалося з «Удара грома», і ўвесь натоўп адразу ж падхапіў знакамітае «О-о-о!» Затым адзін за другім былі выканаы амаль усе іх легендарныя хіты — «Пякельныя званы», «Назад, у Чорнае», «Ты гатовы?», «Высокае напружанне», «Для тых, хто з рокам...» і іншыя. Нельга сказаць, што канцэртнае шоу АС/ДС вылучаецца большай разнастайнасцю: у параўнанні з «Пінк Флойд», «Скорпіёнс» альбо «Бон Джові», яна проста «піянерская» — няма такога багацця асвятлення, дыму і іншых эфектаў, але затое ўражвае іншае: пры ўсёй прастаце песен гурт з такой энергіяй і нават з нейкім нястрымным шаленствам імкнецца выканаць іх для гледачоў, што здаецца, што кожная такая песня — апошняя ў іх жыцці! Напэўна, так і павінны іграць прафесіяналы — на поўную сілу. І гэта праз 20 гадоў! Яны па-ранейшаму напоўнены высокім напружаннем, той магічнай «рокавай электрычнасцю», якая б’е па галаве і запаўняе ўсіх паклоннікаў энергіяй і весселлем.

**«А-эс-маланка-Д-эс» — так міла называюць іх ў нас у «народзе». Да новых сустрэч, «Маланка»!**

**Ангус, прывітанне з Мінска!**

**Для таго, каб павіншаваць каго-небудзь з АС/ДС, можна адправіць ліст па адрасу:** 11 L*edmin*ster *Road, Morden, Surrey RN4 CAN. En*glan*d.*

**Фэн-клуб АС/ДС размешчаны па адрасу: 18** *VVATSON C\OSE, Bury, St Edmond*s, *Suffo*lk, Englan*d.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

220079, 1-ы Загарадны зав., 3.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

11 лістапада
Зак. 1710.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ